УДК 930(476)

***Малыхіна Л.Ю.***

# ПРАБЛЕМА ПЕРШАГА АБВЯШЧЭННЯ БССР Ў ЛІТАРАТУРЫ САВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ (1920-я – 1970-я гг.)



Здымак 1 – Будынак у Смаленску, дзе адбыўся І з‘езд КП(б)Б і была абвешчана ССРБ.

Каталізатарам беларуска-расійскіх адносін пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі стаў адпраўны момант развіцця беларускай савецкай дзяржаўнасці – абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ, БССР). Прыгадаем карціну таго, што здарылася. Беларускія секцыі РКП(б) і Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) пад кіраўніцтвам А.Р.Чарвякова з пачатку 1918 г. ініцыіравалі абвяшчэнне БССР ў маскоўскім бальшавіцкім цэнтры. 21 – 23 снежня 1918 г. у Цэнтральнае Бюро (ЦБ) Маскоўская канферэнцыя Беларускіх секцый РКП(б) выбірае З.Жылуновіча, Ф.Балбеку, А.Чарвякова. Таго ж 23 снежня ЦВК РСФСР (узначальваў Я.Свярдлоў) прымае пастанову пра зацвярджэнне Заходняй камуны як тэрытарыяльнай адзінкі РСФСР у складзе Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губерніі (існавала да 2 лютага 1919г.). 25 снежня кіраўнік Народнага камісарыята па нацыянальных справах РСФСР І.Сталін прапануе прадстаўнікам Белнацкама вылучыць кандыдатаў ва ўрад БССР. 30 – 31 снежня на VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) ў Смаленску ўтвараецца Камуністычная партыя Беларусі. Пры удзеле і тых камуністаў, якія выказвалі непрыхільнасць да ідэі незалежнай дзяржаўнасці, на чале са старшынёю Паўночна-Заходняга камітэта РКП (б) А.Ф. Мясніковым (Мяснікянам), была абвяшчэнна ССРБ. Напісаны Жылуновічам яшчэ ў Маскве Маніфест аб абвяшчэнні рэспублікі быў падпісаны ўноч з 1 на 2 студзеня 1919 г. 7 прадстаўнікамі ад Беларускіх секцый РКП(б) і 12 – ад групы Заходняй Камуны (фактычных праціўнікаў БССР). 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) паста-наўляе адарваць ад ССРБ Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую губерніі. 2-3 лютага на І з'ездзе Саветаў ССРБ ў Мінску было абрана ЦБ КП(б)Б у духу патрабаванняў Леніна і Свярдлова (без групы так званых «незалежнікаў» - Ф.Шантыра, У.Фальскага, Я.Дылы, А.Квачанюка, першага старшыні часовага ўрада ССРБ З.Жылуновіча). 5 лютага стварэецца новы ўрад пад старшынствам А.Мяснікава. 27 лютага 1919 г. з'яўляецца Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі (ЛітБел), у органы кіравання якой не ўвайшоў ніхто з беларусаў. У сакавіку 1919 г. ліквідуецца Белнацкам. А 17 ліпеня 1919 г., калі неакупаванымі палякамі засталіся толькі некалькі паветаў Міншчыны, ЦК РКП(б) распускае ЛітБелССР. Фактычна першую спробу ўтварэння на Беларусі савецкай краіны можна было лічыць няўдалай.

Апазіцыйныя савецкай уладзе і РСФСР колы, у першую чаргу ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), жадалі даказаць фіктыўнасць абвешчанай 1 студзеня 1919г. рэспублікі, адсутнасць асабіста абранага ёю шляху развіцця. Мела пад сабою падставу сцвярджэнне аб вымушаным характары з’яўлення ССРБ у процілегласць БНР. Не пазбаўлена рацыі і меркаванне аб тым, што Савецкая Беларусь стала штучным марыянетачным утварэннем дзеля дэманстрацыі перад сусветнай грамадскасцю рэалізацыі ідэй “Дэкларацыі правоў народаў Расіі” напярэдадні Парыжскай мірнай канферэнцыі. У свеце дадзеных сцвярджэнняў, асабліва цікавымі становяцца даследаванні факта ўтварэння Савецкай Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі савецкага часу, якія ўяўлялі сабою афіцыйны адказ на крытычныя заўвагі апанентаў.

Навука з 1920-х гадоў спрабавала ацаніць умовы і прычыны дзяржаваўтварэння і ўжо ў 1970-я гады дала магчымасць прааналізаваць ступень легітымнасці першай савецкай дзяржаўнасці на Беларусі. Гэтыя пошукі амаль заўсёды прыводзілі навуку да высвятлення ролі бальшавіцкай партыі ў стварэнні ССРБ, вывучэнні нацыянальнай палітыкі Савецкай Расіі.



З. Х. Жылуновіч (1920-я гг.)

Летапіс першых рэвалюцыйных пераўтварэнняў складваўся спачатку непасрэднымі ўдзельнікамі арганізацыі рэспублікі. Сярод іх былі В.Г.Кнорын, Дз.Ф.Жылуновіч, А.Р. Чарвякоў, якія надрукавалі ў перыядычных выданнях (газетах “Звязда”, “Молот”, часопісе “Полымя”) шэраг артыкулаў па актуальным тэарэтычным і практычным пытанням палітыкі краіны. Іх работы ўяўлялі сабою апублікаваныя даклады,

***Малыхіна Людміла Юр’еўна.*** *Старшы выкладчык кафедры сацыяльна-палітычных і гістарычных навук Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.*
*Беларусь, БДТУ, 224017, г. Брэст, вул. Маскоўская, 267.*

выступленні ў сувязі з канкрэтнымі крокамі па ўтварэнню дзяржавы, дзе сустракаюцца першыя спробы даць абгрунтаваную ацэнку розным накірункам палітычнай дзейнасці.[1] Ужо ў час грамадзянскай вайны з'явіліся першыя зборнікі дакументаў маскоўскіх выданняў па перыяду 1918-1920 гг., у якіх Беларусь разглядалася толькі ў якасці аб'екта міжнародных зносін.[2]



*А. Р. Чарвякоў (1920-я гг.)*



*А. Ф. Мяснікоў (1918 г.)*

У пачатку навуковага даследвання праблемы яшчэ сустракаліся працы, дзе закранался пытанне аб ролі нацыянальных арганізацый і мясцовых секцый РКП(б) у адносінах да абвяшчэння ССРБ. Але ў іх заўсёды падкрэсліваўся інтэрнацыянальны характар абвяшчэння Савецкай Беларусі, абумоўленасць усялякіх станоўчых сацыяльных заваёваў кіруючай роляй "партыі Леніна і Сталіна". Вядомыя ў 1920 - 1930-я гг. дзеячы Камуністычнай партыі Беларусі, а таксама гісторыкі, якія працавалі ў Белдзяржуніверсітэце і Інбелкульце, прадоўжылі публікацыі даследванняў па гісторыі першага абвяшчэння БССР. У іх больш увагі ўдзялялася архіўным дакументам, пераважна партыйнага паходжання.

Першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук У.М. Ігнатоўскі ў сваіх работах адзначыў станоўчую ролю Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі (1918), якая стварыла ўмовы для дэнансацыі Брэскага міру і ўтварэння ССРБ. Прыкладна ў гэты ж час, пісаў гісторык, адбыўся дзяржаўны пераварот ў Польшчы, дзе на змену рэвалюцыйна-дэмакратычнаму ўраду прыйшоў урад кансерватараў. Спрыяльная абстаноўка для экспарту рэвалюцыі на Захад знікла. "Менавіта у гэты час трэба было ўтварыць Савецкую Беларусь, каб зачыніць апошняе акно на заходняй мяжы і не дапусціць нападзення на Савецкую Расію з мэтаю падавіць рэвалюцыю", - сцвярджае У.Ігнатоўскі.[3,229] У святле гэтага, піша доктар гістарычных навук І.М.Ігнаценка, непераканаўча гучыць тое, што гаварылася на VI абласной канферэнцыі РКП(б). У яе дакуменце напісана:"Мы павінны разбудзіць дрэмлючыя сілы працоўных масаў Заходняй Камуны. Прыйшоў час, калі Заходняя вобласць павінна сказаць: наша шчасце ў нашых руках, і самавызначэнне працоўных залежыць ад саміх працоўных. Заходняя Камуна павінна абвясціць сябе вольнаю Беларускаю Савецкаю Рэспублікаю".

Да 10-годдзя Савецкай ўлады былі прымеркаваны працы А.Р. Чарвякова – камісара асветы ў Часовым рэвалюцыйным урадзе БССР у 1919 г.[4] У іх увага прыцягнута да работы І Усебеларускага кангрэсу, дзейнасці "беларускіх нацыяналістаў" у справе дзяржаўнага будаўніцтва (да ўсталявання савецкай ўлады і ў далейшым) – таму, што будзе выкрэслена, як не варты вывучэння нацыянальны аспект, ужо пад канец 1920-х гадоў. Але ж і ў 20-х, нягледзячы на адносную лібэрызацыю, захоўваўся дастаткова жорсткі ідэялагічны кантроль за гістарычнай навукай. На дзіва, менавіта ініцыятар правядзення VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) В.Г.Кнорын (Кнорыньш) яшчэ ў 1924-м прызнаваў, што ўпершыню ідэя беларускай дзяржаўнасці была ўсёж такі сфармулявана прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху, якія абвясцілі БНР. Менавіта ён, сакратар Цэнтральнага Бюро КП(б)Б, калісьці адзначаў, што ў перыяд нямецкай акупацыі адбыўся працэс "засвойвання масамі ідэі беларускай незалежнасці, якой партыі трэба было надаваць увагу [...] БССР была заснавана для таго, каб забяспечыць уплыў на масы, якія ішлі за буржуазнымі нацыяналістамі".[5,219] Пацвярджаючы справядлівасць разгону І Усебеларускага з'езда, В. Кнорын піша, што толькі так можна было замацаваць дыктатуру пралетарыята на Беларусі, прыцягнуць на свой бок тых, хто несвядома ішоў за беларускімі "учрадзілаўцамі".[6,90] Як лічыць І.М. Ігнаценка, тут В. Кнорын дапускае памылку – на Беларусі, як і ў Расіі цалкам, дыктатуры пралетарыяту яшчэ не было. Наўрад ці адбылася памылка – наступіў новы пасля беларусізацыі перыяд гісторыі, калі вядучая роля ў вызваленні некалі прыгнечаных народаў стала свядома надавацца выключна Камуністычнай партыі. У пагромным і дырэктыўным артыкуле В. Кнорын накінуўся на ўвесь ход ведзенай да таго навуковай працы па гісторыі Беларусі: "Права беларускіх працоўных на беларускую мову вынікае зусім не з таго, што жыў і працаваў на беларускай мове сярэдневяковы манах Скарына... Мы так раскрытыкуем Смаляцічаў і Тураўскіх, што двух радкоў ім будзе шкада прысьвяціць у гісторыі".[7,4] Гэта быў першы сігнал новага курсу нацыянальнай палітыкі Масквы ў Беларусі. З ім з'явілася цэлая серыя падобных артыкулаў у маскоўскай прэсе ("Правда"), і яшчэ ў большай колькасці ў газетах і часопісах БССР, і нават асобныя брашуры і кнігі. Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б, скліканы ў 1930 годзе спецыяльна па пытанні нацыянальнай палітыкі кампартыі ў БССР, надаў гэтай падрыхтоўчай кампаніі ў прэсе і друку афіцыйнае завяршэнне. Уся папярэдняя даследчая праца была абвешчана "контррэвалюцыйнай", урадава спынена і забаронена. Усе навуковыя выданні і падручнікі з бібліятэк былі канфіскаваны. На беларускую інтэлігенцыю быў павешаны ярлык "нацыянал-дэмакратызму". Першымі ў гэтым былі абвінавачаны У.М. Ігнатоўскі, А.Р. Чарвякоў і Дз. Жылуновіч. Апошнія не вытрымалі цяжару абвінавачання і скончылі жыццё самагубствам. Доктар гістарычных навук (з 1935г.) В.Г.Кнорын, непасрэдны распрацоўшчык ідэялагічных установак аб контррэвалюцыі нацыянальнага дэмакратызму, у 1938 г. сам быў прыгавораны да расстрэлу.

Далейшая навуковая работа была падпарадкавана справе ўмацавання дыктатуры правячай партыі. Яшчэ ў 1929 г. былі заснаваны Інстытут гісторыі, а тасама Навукова-даследчы інстытут па вывучэнню гісторыі КП(б)Б і рэвалюцыйнага руху. Супрацоўнікамі апошняга ў 1934 г. быў падрыхтаваны зборнік "КП(б) у рэзалюцыях. 1903-1921 гг., у якім змяшчаліся асноўныя дакументы па ўтварэнню БССР". Развіццё гістарычнай думкі запаволіў працэс пераадолення так званых ненавуковых канцэпцый і поглядаў (народніцкіх, меньшавіцкіх, нацыяналістычных) і перахода на пазіцыі марксісцкай метадалогіі. Сведчаннем гэтага сталі публікацыі В.К. Шчарбакова, В. Карніенкі і іншых, дзе крытыкаваліся погляды і меркаванні У.М.Ігнатоўскага, М.В. Доўнар-Запольскага аб ролі рэгіянальных палітычных арганізацый у падрыхтоўцы нацыянальнага будаўніцтва.[8] Тэзіс аб кіруючай ролі маскоўскага бальшавіцкага цэнтру ў дараванні свабоды і незалежнасці нацыянальным акраінам у 40-я гады становіцца дамінуючым. На ім абгрунтавана канцэпцыя ўтварэння БССР у манаграфіі Е.Карнейчыка.[9,231] У.Ф. Лочмель у адной са сваіх манаграфій, прысвечаных барацьбе беларускага народа супраць польскіх паноў, таксама падкрэсліваў, што VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя ажыццяўляла

на практыцы ленінска-сталінскую палітыку, калі выказвалася за ўтварэнне ССРБ, і што І.Сталін непасрэдна кіраваў арганізацыяй рэспублікі, даваў дырэктывы і ўказанні ўраду БССР праз А.Мяснікова. Непрыкрытае ўмяшанне ва ўнутраныя справы краю, якое зараз успрымаецца як парушэнне аб'яўленага суверэнітэту, У.Ф.Лочмель падае як законнае і натуральнае ў канкрэтных гістарычных абставінах, паколькі "з'езд Саветаў БССР [2.2. 1919] выражаючы свабодную волю працоўных Беларусі прымае рашэнне аб усталяванні федэратыўнай сувязі з брацкай РСФСР".[10,87-88] Але аўтарам нічога не гаворыцца аб тым, што таго ж 2 лютага 1919 г. на пашыраным паседжанні ЦБ КП(б)Б старшыня Усерасійскага ЦВК Я.М.Свярдлоў абаснаваў утварэнне адзінай Літоўска-Беларускай рэспублікі "каб засцерагчы ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных інтарэсаў".[11] Так, у адпаведнасці з устаноўленымі ідэялагічнымі канонамі, стала праводзіцца фальсіфікацыя фактаў, або іх замоўчванне.

У пасляваенным навуковым асяроддзі асаблівая ўвага надавалася гісторыі савецкага часу. Сярэдзіна 50-х – 70-я гады - найбольш плённы этап у гістарыяграфіі Беларусі. У гэты час не толькі павялічваецца колькасць даследванняў, але і набываецца пэўны паварот ад ідэялагічных схем да вывучэння канкрэтных гістарычных крыніц (але даследаванні былі абмежаваны існаваннем спецыяльных сховішчаў недатыкальных дакументаў). І хоць гісторыкі часам злоўжывалі цытатамі класікаў марксізму-ленінізму, у распрацоўцы міжваеннага перыяда адбываюцца якасныя змены. На павышэнне якаснага ўзроўню навуковых прац паўплывала далейшая сістэматызацыя і апублікаванне ўспамінаў, архіўных матэрыялаў па савецкаму перыяду, дзе асобнае месца належыць зборніку "Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918 – 1920 гг.", аўтарам прадмоў да якога быў В.А.Круталевіч. [12]

Значна ўзраслі нацыянальныя кадры. Так, калі ў 1940 г. гісторыкаў з вучонай ступенню было не болей 10, то у 1963 г. – ужо больш 200, у тым ліку 9 дактароў навук. Пачынае складвацца навуковы лёс буйнейшых спецыялістаў у вобласці нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння на Беларусі – Н.В.Каменскай, В.А.Круталевіча, І.М.Ігнаценкі і іншых.


Н.В.Каменская.

Так атрымалася, што і Н.В. Каменская і В.А. Круталевіч, былі родам з Магілёўшчыны, але падзяляліся дзесяцігоддзем не толькі на розныя пакаленні, а і на розныя светапогляды ў адносінах да гісторыі БССР. У пачатку 1950-х – 1960-я першы этап існавання савецкага ладу знайшоў сваё алюстраванне пераважна ў працах Н.В. Каменскай. Стварэнне дзяржавы і ажыццяўленне ў ёй "ленінскай нацыянальнай палітыкі" раскрываюцца ў яе манаграфіі "Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" (1946), перавыдадзенай ў 1948 і 1954 гг.[13] Асноўныя ідэі ў скарочаным варыянце гучалі на публічных лекцыях, з якімі аўтар выступала ў г. Мінску, а таксама служылі матэрыялам у дапамогу лектарам. Гэта, безумоўна, сведчыла аб наяўнасці дзяржаўнага заказу на адпаведнае асвятленне тэмы. Уважліва аналізуючы падзеі, Н.В.Каменская ўжо ў рабоце за 1946 г. ставіць пад сумненне тэзіс аб выключнай ініцыятыве ўрада РСФСР у хутчэйшым праяўленні на Беларусі права нацый на самастойнае вырашэнне лёсу: "Перш чым аб'явіць Беларусь самастойнай рэспублікай, неабходна было ўмацаваць у ёй савецкую ўладу, што і ўзялі на сябе абласныя органы – Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) і Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці",- сцвярджае аўтар.[14,47] І ўсё ж аўтар не пазбегла гістарыяграфічнага клішэ, паўтараючы, што менавіта партыя бальшавікоў яшчэ ў снежні 1917 г. паставіла пытанне аб стварэнні БССР. Не падвергся крытычнаму аналізу і той факт, што дэлегацыя беларусаў ад'язджала ад І.Сталіна 29 снежня 1918 г. з Масквы ў Беларусь з дакладна і ясна вызначанай праграмай па стварэнню БССР. Не вялася гаворка аб пасіўнай абыякавасці мясцовага кіраўніцтва (Н.В. Каменская ўзгадвае канфлікт з "замаскіраванымі ворагамі савецкай улады – Жылуновічам, Лагуном, Чарвяковым" і іншымі). Але пытанне аб беспрэцэдэнтным адыходзе этнічна беларускіх зямель у склад РСФСР было апушчана, а гісторыя самой ССРБ разглядалася толькі да падзей І З'езда Саветаў БССР, дзе сярод шэрага прынцыпова важных праблем, аўтар разглядала толькі самую станоўчую – прыняцце Канстытуцыі. У выданні "Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР"(1954) ужо абыйдзены ўвагай факт супрацьстаяння камуністаў-"незалежнікаў" і прыхільнікаў Заходняй камуны. Далейшая распрацоўка падзей 1918-1919 гадоў непазбежна прывяла даследчыцу да пераасэнсавання сваіх пазіцый.[15] У 1959 г. Ніна Васільеўна абараніла доктарскую дысертацыю і па службовай лесвіцы ўзыйшла ажно да пасады дырэктара Інстытута гісторыі АН Беларусі (1965-1969), і дырэктара ўжо узгаданага Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б (1969-1974). У рабоце «Образование Белорусской Советской Социалистической Республики» (1968) Н.В.Каменская прызнае памылковасць сцвярджэння гістарычнай літаратуры 40-х – першай паловы 50-х гг. аб тым, што ўжо ў снежні 1917 г. бальшавікамі ставілася пытанне аб утварэнні Беларускай ССР: «Основанием для такого утверждения служили некоторые косвенные факты, касающиеся политики Советского правительства по отношению к белорусским национальным организациям. Однако, как показали дальнейшие исследования, в сложной военно-политической обстановке, когда Белоруссия была разделена ещё линией русско-германского фронта, когда рабочие и крестьяне вынуждены были вести политическую и вооружённую борьбу против польского корпуса Довбор-Мусницкого, когда шла острая классовая борьба между силами революции и силами контрреволюции, в т. ч. буржуазно-националистической, ратовавшей за «незалежнасть Белоруссии», когда на первом плане стояла задача сохранения и укрепления главного завоевания социалистической революции – Советской власти, практическое решение вопроса о создании Белорусской Советской Социалистической республики, естественно, потребовало определённого времени, необходимых условий для реализации ленинских принципов в национально-государственном строительстве».[16,8]. Значным укладам у беларускую гістарыяграфію стаў выхад у свет калектыўнай манаграфіі "Победа Советской власти в Белоруссии"(1967) пад рэдакцыяй І.І. Мінца, Н.В. Каменскай, І.С. Краўчанкі, хаця ў цэлым і гэтая работа носіць апалагетычны характар.

Працэс стварэння органаў дзяржаўнага кіравання ў ССРБ патрабаваў аналізу спецыяльных навук. Вялікая колькасць навуковых прац па гэтай праблеме належыць юрыстам. Яны ўздымаюць пытанне аб легітымнасці працэса ўтварэння БССР не з абстрактных гістарычна-філасофскіх, а з прававых нормаў, робяць ацэнку рэальных паўнамоцтваў новаяўленай рэспублікі. Не падвяргалася сумненню правасуб'ектнасць ССРБ да ўваходжання ў СССР у работах Ю.П. Браўко.[17] Першым крокам станаўлення беларускай дзяржаўнасці прысвечаны манаграфічныя работы С.П. Маргунскага, у якіх даецца агляд першай Канстытуцыі БССР 1919 г., раскрываецца гісторыя

краіны, сутнасць і асаблівасці палітычных і эканамічных сувязей БССР з РСФСР. Як лічыў аўтар, пры вызначэнні тэрыторыі нашай краіны пераважнае значэнне мелі не этнаграфічныя межы рассялення беларусаў, а моманты міжнароднай палітыкі. Ва ўмовах напружаных унутраных і міжнародных абставін, якія патрабавалі захавання цесных палітычных і гаспадарчых сувязей паміж будуючай сваю дзяржаўнасць маладой рэспублікай і РСФСР, Беларусь, па сутнасці, заставалася састаўной часткай Расійскай Федэрацыі.[18] Звяртаючыся да работ В.А. Круталевіча, С.П. Маргунскі заўважыў, што ў асобных з іх існуюць спрэчныя ацэнкі шэрага важных гістарычных фактаў. І сапраўды, калі С.П.Маргунскі выказвае адабрэнне палітычнай інтэграцыі БССР у склад РСФСР, то В.А.Круталевіч выступае абаронцам нацыянальных інтарэсаў беларускага народа.


В.А.Круталевіч.

Грунтоўна, на падставе велізарнага дакументальнага матэрыялу пабудавана канцэпцыя стварэння БССР у навуковых працах В.А. Круталевіча.[20] Безумоўна, кірунак яго даследванняў у многім вызначаўся пэўным ідэялагічным заказам з боку Кампартыі. У сваёй знакамітай манаграфіі “Рождение Белорусской Советской Республики” (1975) вучоны адзначае, што Дэкларацыя па нацыянальнаму пытанню, прынятая на II абласным з’ездзе Саветаў [красавік 1918] ахарактарызавала Беларускую раду як групу самазванцаў. У той жа час у дакуменце нічога не было сказана аб праве беларускага народа на самавызначэнне, якое атрымала заканадаўчае афармленне ўжо ў першых актах Савецкай дзяржавы, тым самым было абыйдзена пытанне аб нацыянальным дзяржаўным будаўніцтве беларускага народа.[21,312] Працяг кнігі, які з’явіўся ў 1979 г., адлюстраваў далейшы працэс ўсталявання савецкай улады ў рэспубліцы. Адчуваецца, што вучоны ў тых палітычных умовах спрабаваў правесці крытычны аналіз утварэння БССР, як гэта ні дзіўна, праз зварот да так званай фальсіфікацыі гісторыі замежнымі саветолагамі, што было адзінай магчымасцю ўсебакова раскрыць праблему. У прыватнасці, саветолагі даказвалі несумяшчальнасць права нацый на самавызначэнне з мэтамі пралетарыяту, а пралетарскага інтэрнацыяналізму - з нацыянальнымі інтарэсамі.[22,310] Перакананне В.А. Круталевіча ў тым, што немагчыма адасабляць дату нараджэння БССР (як лічылі, 31 снежня 1918) і дату абвяшчэння рэспублікі (1 студзеня 1919) было ў далейшым прынята гістарычнай навукай. А ўключэнне доктарам юрыдычных навук В.Круталевичам ў праблематыку манаграфіі пытанняў аб Літоўска-Беларускай ССР і другім абвяшчэнні БССР лагічна завяршыла аналіз няпростых абставін з’яўлення беларускай дзяржаўнасці. Публікацыі гэтага аўтара, пры нязменнасці ідэалагічных установак і ацэнак да 80-х гадоў, атрымалі ў другой палове 60-х – 70-я гады прызнанне і часта цытаваліся нават замежнымі вучонымі, паколькі змяшчалі багаты фактычны матэрыял (патэнцыяльна для чытача існавала магчымасць самастойных уражанняў, заключэнняў, нярэдка супрацьлеглых).

Усебаковы падыход да даступных даументаў і публікацый па тэме становіцца рэчаіснасцю ў 70-я. Зноў на павестку дня ўзыйшло пытанне аб ролі беларускіх секцый РКП(б) і Беларускага нацыянальнага камісарыята ў нараджэнні беларускай рэспублікі. Асвятленню дзейнасці Белнацкама, у прыватнасці, знайшлося месца ў рабоце М.І. Кулічэнка “Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918 – 1920 годах” (1963).

І.І. Коўкель у сваёй кандыдацкай дысертацыі пад кіраўніцтвам І.М. Ігнаценкі зрабіў першае ў савецкай гістарыяграфіі даследаванне “ідэйнага краху і палітычнага банкруцтва беларускай нацыянальнай контррэвалюцыі ў 1919-1925 гг.” (што стала лагічным працягам выдання В.А.Круталевіча “Провал контрреволюционных планов создания белорусского буржуазного государства и образование БССР (октябрь 1917 – февраль 1919 гг.)”). Яго работа ўяўляе спробу аргументаванага адказу на тэзіс замежных гісторыкаў Н.Вакара, У.Каларц, Р.Пайпса, Э.Карра пра тое, што Вялікая Кастрычніцкая Рэвалюцыя не вырашыла нацыянальнага пытання, а вось праціўнікі савецкай ўлады выступалі за нацыянальную дзяржаўнасць. На думку І.І. Коўкеля, крах нацыянальнай контррэвалюцыі прадухіліў утварэнне беларускай савецкай дзяржавы.[23] Цікавасць да крытычнага аналізу работ замежных саветолагаў, якія “скажалі” палітыку Савецкай ўлады па нацыянальнаму пытанню, стала распаўсюджаным з’яўленнем (якое можа быць растлумачана распальваннем “халоднай вайны” ў свеце). У гэтым сэнсе работа І.А. Бродкі (навуковым кіраўнікoм якой таксама быў І.М. Ігнаценка) “Критика буржуазной фальсификации истории образования БССР” з’явілася своеасаблівай гістарыяграфіяй замежных работ па праблеме.[24] Дысертацыйныя работы, якія былі зроблены пад кіраўніцтвам І.М. Ігнаценкі сталі асноваю ў далейшым для крытычнага пераасэнсавання факта ўтварэння БССР. (Сам І.М. Ігнаценка ўключыў тэматыку ўтварэння БССР ў круг свайго даследавання толькі ў 80-я). У гэтых працах ўпершыню за пасляваенны час была зроблена прывязка акта ад 1 студзеня 1919 г. да нацыянальнага руху на Беларусі ў 1917 –1918 гг. Тым самым быў накшталт зруйнаваны тэзіс аб тым, што ўтварэнне беларускай дзяржавы было прэрагатывай толькі КП(б) і адбылося ўпершыню.

Такім чынам, яўнае звужэнне тэматыкі абвяшчэння Савецкай Беларусі ў 30-я – 40-я гады было не выпадковым фактарам: тым самым абыходзіліся спрэчныя праблемы будаўніцтва рэспублікі, і толькі так можна было не проста апраўдаць, а нават узвысіць камуністычную дыктатуру ў сферы дзяржаваўтварэння. Пераход да ідэялагічнага схематызму, начотніцтва ў даваенныя гады, рэпрэсіі супраць дзеячаў першага ўрада БССР і навукоўцаў у 1929 – 1937 гг. дрэнна паўплывалі на якасны стан літаратуры па праблеме абвяшчэння савецкай рэспублікі на Беларусі. З энцыклапедычных зборнікаў, вучэбнай літаратуры на доўгі час знікаюць імёны В.Г. Кнорына, У.М. Ігнатоўскага, А.Р. Чарвякова, Дз. Жылуновіча, А.Балбекі і іншых. Пэўны пералом у навуковым асяроддзі наступае пасля XX з’езда КПСС: узнікае інтарэс да ролі самога беларускага народа ў падзеях 1917 – 1919 гг., да канкрэтных мерапрыемстваў па утварэнню дзяржапарата. У навуковы абарот вяртаецца частка матэрыялаў, якія тычацца антысавецкіх выступленняў, складанага вырашэння праблемы межаў; публікуюцца дакументы, якія служаць доказам дыктату Расійскага ўрада ў стасунках з маладой краінай. І сёння не страціла сваёй навуковай вартасці двухтомнае манаграфічнае выданне прафесара В.А.Круталевіча “Рождение Белорусской Советской Республики». Але ў цэлым, у літаратуры пасляваеннага перыяду істотных змен у падыходах да асвятлення нацыянальнага руху на Беларусі не адбылося. Як і раней, аўтары ў асноўным не адыходзілі ад устаноўленай у гады сталіншчыны ацэнкі ўтварэння БССР. Было прынята моўчкі абыходзіць пытанні аб тэрміне рэальнага існавання рэспублікі пасля першага абвяшчэння і яе паўнамоцтвах. Сцвярджалася, што толькі для “буржуазных” гісторыкаў і сацыёлагаў нацыянальная свядомасць вымяраецца ступенню міжнацыянальных зносін, барацьбою за самастойнае дзяржаўнае існаванне, а для сацыялізма гэтыя меркі не падыходзяць. Лічылася, што гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў савецкай краіне павінна стаць гісторыяй станаўлення дзяржаўных формаў у мэтах далейша-

га ўз'яднання раўнапраўных народаў.[25] Палажэнне аб спыненні, а тым больш скасаванні дзейнасці ўрада ССРБ у 1919 г. увогуле лічылася неправамочным, паколькі з'яўленне Савецкай Беларусі, пераход яе да саюзу з Літвой і другое абвяшчэнне БССР бачылася толькі пераходным, эвалюцыйным этапам да саюзу савецкіх рэспублік.[19, 7] Тыя публікацыі, якія прапанаваліся шырокаму колу чытачоў былі накіраваны на рэабілітацыю існуючага камуністычнага рэжыма. Таму літаратура 1920-х – 1970-х гг. па праблеме ўтварэння БССР характарызуецца агульнай ідэйнай напоўненасцю. Даследаванні пасляваенных гадоў проста вярнуліся да таго ж набора метадаў гістарычнага пошуку, да тых пазіцый, якія існавалі да рэпрэсіўнай кампаніі 30-х гадоў, толькі на больш узбагачонай дакументальнай базе.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. *Жылуновіч З.Х.* 1-е студзеня – рэвалюцыйна-гістарычнае свята Савецкай Беларусі// Полымя.-1922.-№1; Ён жа. Уступамі да Акцября// Полымя.-1923.-№5,6; Ён жа. Будаванне Савецкай Беларусі// Маладняк.-1925.-№6; Ён жа. Беларускія сэкцыі РКП і стварэньне Беларускай Савецкай Рэспублікі// Полымя.-1928.-№10; Ён жа. За дваццаць лет: (Успаміны)// Полымя.-1929.-№5; *Кнорин В.* Революция и контрреволюция в Белоруссии. Ч.1.-Смоленск, 1920; Ён жа. Пять лет: Краткий конспект истории КП(б) Б.-Мн., 1922; Ён жа. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте.-Мн.,1925; Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Ч.1. Беларусізацыя.-Мн.,1928.
2. Красная книга: Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918-1920 гг.-М.,1920; Политика Советской власти по национальному вопросу за три года, 1917. XI –1920 гг. - М,1920; Советская Россия и Польша. - М.,1921.
3. *Ігнатоўскі У.* Камуністычная партыя Беларусі і беларускае пытанне// Польшча.-1922.-№1.
4. *Чарвякоў А.Р.* За Савецкую Беларусь.-Мн., 1927; Ён жа. Белоруссия к X годовщине Октября. - Мн., 1927.
5. *Кнорын В.* Камуністычная партыя на Беларусі// Беларусь. Нарысы гісторыі эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху. –Мн.,1924.
6. *Кнорын В.* Да гісторыі дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі.-Мн., 1930.
7. *Кнорын В.* Аб рашаючых "дробязях" у вялікім пытаньні// Асьвета (Менск).-1928.-№4.
8. *Шчарбакоў В.К.* Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя.-Мн., 1030; Ён жа. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі.- Мн., 1934; *Карніенка В.* Клясавая барацьба на гістарычным фронце Беларусі.-Мн., 1932.
9. *Карнейчык Е.* і др. В.І.Ленін і І.В.Сталін – арганізатары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі./Пад рэд. кан.філ.навук І.Чынбурга.- Мн., 1949.- С.231.
10. *Лочмель У.Ф.* Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов.- М., 1940. –С.87-88.
11. По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Документы и материалы.-Мн.,1988.-С.130.
12. Из истории Советской власти в Белоруссии и образования БССР: Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4.- Мн., 1954; В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте: Воспоминания активных участников Октябрьской революции.- Мн., 1957; Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Т.1-2.-Мн., 1957; Съезды Советов Советских Социалистических Республик. Сборник документов 1917-1922 гг.-М.,1960.-Т.2; Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 – июль 1920г.). Сборник документов и материалов.-Мн.,1961; Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. 1-3.- М., 1963-1965; Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918-1920 гг.: Сборник документов и материалов. Т.1. (февраль 1918-февраль 1919г.).- Мн., 1968.-602 с.; Т.2. (февраль 1919-1920 г).- Мн., 1971.-632 с.; *Куличенко М.И.* Борьба Коммунистической партии за решение национального вопроса в 1918-1920 гг.-М.,1963.
13. *Каменская Н.В.* Образование Белорусского советского государства (Второе дополн. и исправл. изд.).- Мн.,1948; Яна ж. Вялікая Кастрычніцкая Сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР.- Мн.,1954.
14. *Каменская Н.В.* Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. /Пад рэд. Г.М. Панкратавай.- Мн., 1946. С.47.
15. *Каменская Н.В.* Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 – июль 1917г.).- Мн.,1957; Яна ж. Участие белорусского народа в разгроме интервентов и белогвардейцев и социалистическое строительство в Белоруссии в годы гражданской войны. Автореферат дис…. док. ист наук.- Мн., 1958; Яна ж. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919-1920 гг.).- Мн., 1963; Победа Советской власти в Белоруссии. /Под ред. И.И.Минца, Н.В.Каменской, И.С.Кравченко.- Мн., 1967.
16. *Каменская Н.В.* Образование Белорусской Советской Социалистической Республики. – Мн., 1968. – С.8.
17. *Бровко Ю.П.* Международная правосубьектность БССР. - Мн.,1961; Ён жа. Белорусская ССР – суверенный участник международного общения. - Мн.,1974.
18. *Маргунский С.П.* Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе её развития- Мн.,1953; Ён жа. Создание и упрочение белорусской государственности 1917- 1922.- Мн., 1958; Ён жа. Создание и развитие белорусской государственности (1917 – 1925 гг.). Автореф. дис.... док. юрид. наук.-Мн.,1969; *Маргунский С.П., Кукреш Л.И.* Интернациональное и национальное в государственном строительстве Белоруссии: 1917 – 1922 гг.- Мн., 1978.
19. *Маргунский С.П.* Образование Белорусской Советской Социалистической республики и её первая Конституция. Автореферат дис.... канд. юрид. наук. - Мн., 1951.
20. *Круталевіч В.* Рэвалюцыйныя камітэты Беларусі ў барацьбе за аднаўленне і ўмацаванне Савецкай улады ў рэспубліцы ў 1920 г. //Весці АН БССР, серыя грамадскіх навук 1956, № 2; Ён жа. Административно-территориальное устройство БССР.- Мн., 1966; Ён жа. Першы беларускі ўрад// Полымя.-1966.-№1.-С.132-141; Ён жа. Фальсификация истории создания БССР – одно из направлений антисоветизма Мн., 1972; Ён жа. Провал контрреволюционных планов создания белорусского буржуазного государства и образование БССР. (октябрь 1917 – февраль 1919г.).-Мн.,1973.
21. *Круталевич В.* Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути к провозглашению республики. Окт. 1917 – дек. 1918).- Мн., 1975. С.312.
22. *Круталевич В.* Рождение Белорусской Советской Республики. (Провозглашение республики. Развертывание национально-государственного строительства. Нояб. 1918 – февр. 1919).- Мн., 1979. С. 310.
23. *Ковкель И.И.* Политическое банкротство националистической контрреволюции в Белоруссии (1919-1925).Автореф. дис. …к. ист. наук.-Мн., 1979.
24. *Бродко Н.А.* Критика буржуазной фальсификации истории образования БССР.-Мн.,1987.
25. *Нестерович Я.Ю.* Движение трудящихся Белоруссии за образование Союза ССР в 1917-1924 гг. Автореф. …к. ист. наук.-Мн.,1976.

УДК 354.85